**Н.А.Ляйко,** *дацэнт;*
**А.М.Фёдарава,** *дацэнт;*
**А.І.Фядорына,** *дацэнт;*
**Т.С.Юхнавец,** *старшы выкладчык*

# ВЫКАРЫСТАННЕ СУЧАСНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ ДЛЯ БІБЛІЯТЭК (на прыкладзе выкладання курсаў "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды")

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства, бесперапыннае павелічэнне патоку інфармацыі, выкарыстанне сучасных тэхналогій ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і практычнай дзейнасці ўнеслі змены ў прыярытэтныя напрамкі прафесійнай адукацыі: з'явілася неабходнасць у падрыхтоўцы творчых, свядомых, адказных за сваю справу і канкурэнтаздольных спецыялістаў для сфер навукі, культуры, творчасці, кіравання.

Значнае месца ў падрыхтоўцы такіх кадраў належыць вышэйшай школе, якая працуе ў адпаведнасці з сучаснай канцэпцыяй адукацыі, выхоўвае спецыяліста, здольнага адаптавацца да сучасных умоў жыцця і працы, бесперапыннай самаадукацыі і самаразвіцця.

Сярод важнейшых задач павышэння якасці адукацыі студэнтаў неабходна выдзеліць асноўныя: інтэнсіўны пошук і ўкараненне інавацыйных форм і метадаў навучання; павышэнне вучэбнай матывацыі і фарміраванне ў студэнтаў уменняў і навыкаў самастойнай работы. Дзяржаўная праграма развіцця інавацыйнай адукацыі на 2008–2010 гг. і на перспектыву прадугледжвае актыўную навукова-інавацыйную дзейнасць вышэйшых навучальных устаноў, якая накіравана на падрыхтоўку спецыяліста новага тыпу. Спецыяліста такога тыпу немагчыма падрыхтаваць без выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій. Асаблівае значэнне ў дадзеным выпадку належыць вучэбна-метадычным комплексам (ВМК), якія не толькі ўтрымліваюць поўную інфармацыю па ўсім курсе, але і дапамагаюць ажыццяўляць кантроль за самастойнай работай студэнтаў.

Аналіз нарматыўных дакументаў дазваляе даць наступную трактоўку паняцця вучэбна-метадычнага комплексу. ВМК – гэта

сістэма нарматыўнай і вучэбна-метадычнай дакументацыі, сродкаў навучання і кантролю, неабходных і дастатковых для якаснай арганізацыі асноўных і дадатковых адукацыйных праграм згодна з вучэбным планам [6]. Адпаведна з гэтым асноўнай мэтай стварэння ВМК з'яўляецца забеспячэнне студэнта поўным камплектам вучэбна-метадычных матэрыялаў для самастойнага паглыбленага вывучэння дысцыпліны.

Пры распрацоўцы ВМК па курсах "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды" выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя нарматыўныя дакументы: "Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). Кваліфікацыя – бібліятэкар-бібліёграф" [4], вучэбныя праграмы па курсах "Каталагізацыя дакументаў" [2] і "Бібліятэчныя фонды" [1].

ВМК па курсах "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды" ўключаюць тэматычны план і праграму курса, метадычныя рэкамендацыі і тэмы семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў з указаннем зместу работы і асаблівасцей правядзення заняткаў па кожнай канкрэтнай тэме, матэрыялы для глыбокага засваення курса. Асаблівая ўвага надаецца правядзенню дробнагрупавых заняткаў з выкарыстаннем сучасных тэхналогій. Выкладанне такіх рэсурсных курсаў, як "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды", немагчыма без выкарыстання аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, якія з'яўляюцца інфармацыйнымі кампанентамі інавацыйных працэсаў адукацыі пры падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў.

Графік кантролю за самастойнай работай студэнтаў, заданні і метадычныя рэкамендацыі па асобных тэмах курса канкрэтызуюць патрабаванні, садзейнічаюць творчаму падыходу пры выкананні заданняў.

Рэйтынгавы рэгламент па курсах і тэсціраванне студэнтаў з'яўляюцца добрым матывацыйным сродкам павышэння пазнавальнай актыўнасці студэнтаў, садзейнічаюць больш глыбокаму засваенню курсаў і аблягчаюць падрыхтоўку да залікаў і экзамену.

Вучэбна-метадычны комплекс дапамагае студэнтам у падрыхтоўцы да практычных і семінарскіх заняткаў, пры выкананні заданняў па самастойнай рабоце, у прыватнасці па тых тэмах, якія не разглядаліся на лекцыях. ВМК па курсах "Каталагізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументаў” і “Бібліятэчныя фонды” прадугледжваюць розныя формы семінарскіх заняткаў. Гэта дзелавыя гульні, дыскусіі, абмеркаванні падрыхтаваных дакладаў і інш.

Інфармацыйнае забеспячэнне кантралюемай самастойнай работы, наяўнасць асноўнай і дадатковай літаратуры, тэрміналагічных слоўнікаў па курсах “Каталагізацыя дакументаў” і “Бібліятэчныя фонды”, азнаямленне з канкрэтнымі заданнямі, якія неабходна выканаць у час вытворчай практыкі, забеспячэнне курса вучэбным дапаможнікам (“Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне”) [3] і электроннымі варыянтамі тэкстаў лекцый па курсах садзейнічаюць глыбокаму засваенню дысцыпліны, выкарыстанню нарматыўна-метадычных матэрыялаў і стандартаў па фарміраванні фондаў і арганізацыі каталогаў, выпрацоўцы ў студэнтаў уменняў і навыкаў валодання як традыцыйнай, так і аўтаматызаванай тэхналогіямі фарміравання і апрацоўкі інфармацыйных рэсурсаў на традыцыйных і нетрадыцыйных носьбітах.

Арганічным кампанентам ВМК з’яўляецца алгарытм ажыццяўлення асноўных тэхналагічных працэсаў камплектавання і апрацоўкі дакументнага патоку. Гэта рэалізуецца з дапамогай вывучэння пэўных аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэках Беларусі. Напрыклад, сістэма аўтаматызацыі бібліятэк ІРБІС падтрымлівае як традыцыйныя "папяровыя" тэхналогіі (друкаванне лістоў кнігі сумарнага ўліку, усіх відаў каталожных картак), так і прапаноўвае сродкі для электронных каталогаў. ІРБІС уключае пяць тыпаў аўтаматызаваных рабочых месцаў (АРМаў): “Камплектатар”, “Каталагізатар”, “Чытач”, “Кнігавыдача”, “Адміністратар”. Па курсе “Каталагізацыя дакументаў” дадзеная сістэма дазваляе ствараць розныя формы бібліяграфічных запісаў і электронны каталог, прапаноўвае сродкі для вядзення і выкарыстання баз даных УДК, ББК, рубрыкатара ДРНТІ. На занятках навучэнцы маюць магчымасць ажыццяўляць тэхналогію апрацоўкі дакументаў у электроннай форме з дапамогай АРМа “Каталагізатар”. Непасрэдна працуючы з АРМам “Камплектатар”, студэнты набываюць навыкі працэсаў камплектавання і ўліку фонду бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наяўнасць вучэбна-метадычнага комплексу дазваляе пашырыць арганізацыйныя формы навучання, метады кантролю якасці засваення новага матэрыялу. У прыватнасці, у вышэйназваных курсах акрамя традыцыйных форм і метадаў правядзення лекцыйных, практычных і семінарскіх заняткаў прымяняюцца такія, як лекцыя-прэзентацыя, лекцыя-дыскусія, практычныя заняткі ў выглядзе дзелавых гульняў, семінарскія заняткі ў форме "брэйн-рынг", лабараторныя заняткі з выкарыстаннем дэма-версій аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм і адпаведных АРМаў. Прымяненне такіх форм у вучэбным працэсе садзейнічае паглыбленаму засваенню курсаў "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды", развівае самастойнасць студэнтаў, з'яўляецца лепшым матывацыйным сродкам павышэння пазнавальнай актыўнасці студэнтаў.

Эфектыўнасць выкарыстання ВМК залежыць ад паўнаты яго напаўнення, наяўнасці падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, зместу тэкстаў лекцый як асноўных яго кампанентаў. Адпаведная роля ў ВМК павінна надавацца тэрміналагічным слоўнікам, модульна-рэйтынгавай сістэме і прамежкаваму кантролю ў выглядзе тэсціравання.

Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій пры выкладанні і вывучэнні курсаў "Каталагізацыя дакументаў" і "Бібліятэчныя фонды", іх інфармацыйнае і метадычнае забеспячэнне садзейнічаюць засваенню студэнтамі тэарэтычных ведаў і выпрацоўцы ў іх уменняў, прафесійнай кампетэнцыі ў валоданні як традыцыйнай, так і аўтаматызаванай тэхналогіямі фарміравання і апрацоўкі інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк.

---


1. *Бібліятэчныя* фонды: вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 23.01.11 – бібліятэказнаўства і бібліяграфія / Н.У.Клімянкова, І.М.Стрыжонак, А.М.Багарэвіч, Т.С.Юхнавец. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 24 с.

2. *Каталагізацыя* дакументаў: вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 23.01.11 – бібліятэказнаўства і бібліяграфія / Н.А.Ляйко, А.І.Фядорына. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 29 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3. Ляйко, Н.А.* Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне: вучэб. дапам. / Н.А.Ляйко, А.І.Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – 179 с.

*4. ОС РБ 1-23 01 11-2008.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень: спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках): кваліфікацыя – бібліятэкар-бібліёграф. – Узамен РД РБ 02100.5.211-98; уведз. 2008-09-01. – Мн.: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2008. – 38 с. – (Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь).

*5. Состав* (структура) учебно-методического комплекса (УМК) в Белорусском государственном университете [Электронный ресурс] // Управляемая самостоятельная работа студентов по модульно-рейтинговой системе / ГрГУ, факультет психологии. – Режим доступа: http: // psf.grsu.by / Vch Proc / sam_ rab /03/02.

*6.* http://www.bti.secna.ru/teacher/umk/.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ